Падтрымай "Вясну" на PATREON

Віцебск: яшчэ два штрафы за сюжэт для “Белсата”

13.12.2019 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова




Алена Шабуня і Зміцер Лупач. Фота: baj.by

Суд Віцебскага раёна 12 снежня аштрафаваў журналістаў-фрылансераў **Алену Шабуню** і **Змітра Лупача** амаль на 2 тысячы рублёў паводле артыкула 22.9 КаАП ("Парушэнне заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі”).

Па інфармацыі службы маніторынгу Беларускай асацыяцыі журналістаў, суддзя **Ганна Ігнаценка** прызнала журналістаў вінаватымі ў парушэнні заканадаўства аб СМІ — за супрацу з замежным медыя без акрэдытацыі ў беларускім міністэрстве замежных спраў.

Паводле рашэння суда, Зміцер Лупач мусіць сплаціць у дзяржказну штраф у памеры 42 базавых велічынь, Алена Шабуня — 32 базавыя велічыні.

16 лістапада на тэлеканале “Белсат” быў паказаны відэасюжэт пра жыхароў вёскі Шэвіна, якія адмовіліся ісці на мінулыя парламенцкія выбары з-за даўняй і нявырашанай праблемы. Пратэст вяскоўцаў быў звязаны з тым, што ніводзін дэпутат не дапамог сталым ужо людзям дамагчыся маленькай саступкі — дазволу на праход па тэрыторыі санаторыя “Лётцы”. Раней яны хадзілі па дарозе ўздоўж плота ў суседнія Малыя Лётцы, дзе ёсць крама, аптэка, пошта і чыгуначная станцыя. Цяпер праход закрылі, і вяскоўцам даводзіцца дабірацца па дарозе, якая на тры кіламетры даўжэй.



Увага журналістаў была вельмі дарэчы, сказала на судзе старэйшына вёскі **Антаніна Зайцава**:

> *— Мы куды толькі не звярталіся — і ў віцебскія газеты, і на АНТ, і ў праграму “Времечко”. Карэспандэнты прыязджалі, здымалі, запісвалі, але ніводзін сюжэт пра наша гора так і не выйшаў. Адзінае выключэнне — “Белсат”, і то над людзьмі, якія хацелі нам дапамагчы, зладзілі судзілішча!*

Працэс над журналістамі вяла суддзя Ганна Ігнаценка. На думку Алены Шабуні, паводзіны суддзі былі абуральныя:

> *— Суддзя не задаволіла ніводнага хадайніцтва, у тым ліку на ўдзел у працэсе сябра ГА “БАЖ”, праваабаронцы Паўла Левінава. Яна не давала гаварыць, перабівала, рабіла недарэчныя заўвагі, пагражала. А калі я папрасіла зрабіць перапынак і пайшла да старшыні суда, каб падаць на яе скаргу, суддзя ўжо была там і пра нешта раілася. Верагодна, і рашэнне пра тое, як нас пакараць, яна не прымала самастойна.*

Журналістка пяць разоў заяўляла адвод суду, і шораз суддзя канстатавала, што для гэтага няма падставаў. Паводзіны суддзі Ганны Ігнаценка абурылі і журналістаў, якія прыйшлі асвятляць працэс. А **Паўла Левінава** яна ўрэшце рэшт выдаліла з залы суда, бо ён неаднаразова звяртаў увагу на памылкі падчас разгляду адміністрацыйнай справы.


На думку праваабаронцы Паўла Левінава, якога выдалілі з пасяджэння, суддзя прадэманстравала не толькі прававую непісьменнасць, але і слабае веданне працэсуальнага заканадаўства, таму зрабіла шмат памылак падчас пасяджэння.

Што да вынікаў, то Павел Левінаў гатовы дапамагчы ў абскарджванні пастановы:


> *— Алена Шабуня і Зміцер Лупач рэалізоўвалі сваё права на свабоду выказвання ўласнага меркавання, і за рэалізацыю гэтага права іх караюць. Пра якую прававую дзяржаву тады можна казаць? Скарга будзе пададзена ў Віцебскі абласны суд, а калі гэты орган не верне сітуацыю ў прававое поле, то журналісты будуць вымушаныя звярнуцца ў вышэйшыя інстанцыі, аж да Камітэта ААН па правах чалавека.*

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску


"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY